ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 1 2016
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

*УДК 903/904(476.6)*

*А. М. МАКСІМОВІЧ*

# КУРГАННЫЯ МОГІЛЬНІКІ НА ТЭРЫТОРЫІ БАСЕЙНА РАКІ ШЧАРЫ: ГІСТОРЫЯ ДАСЛЕДАВАННЯ І КУЛЬТУРНА-ХРАНАЛАГІЧНАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь, e-mail: alesmaksimovich@gmail.com*

Данная статья является обощением и анализом информации, относящейся к истории исследования курганных могильников на территории бассейна р. Щары. На основании археологических данных рассматривается вопрос, связанный с определением этнической принадлежности средневекового населения региона.
*Ключевые слова:* археология, курганный могильник, Средневековье, бассейн р. Щары.

*A. M. MAKSIMOVICH*

# MOUND BURIAL GROUNDS ON THE TERRITORY OF SHCHARA RIVER BASIN: HISTORY OF RESEARCHES WITH CULTURAL AND CHRONOLOGICAL INTERPRETATION

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus, e-mail: alesmaksimovich@gmail.com*

This article deals with generalization and analysis of information, which refers to the history of mound burial grounds researches on the territory of Shchara river basin. Also because of archaeological data the question connected with the definition of ethnicity of the Middle Ages population in the region, has been considered.
*Keywords:* archaeology, mound burial grounds, Middle Ages, Shchara river basin.

**Уводзіны.** Курганныя могільнікі з'яўляюцца самай шматлікай групай сярэдневяковых археалагічных помнікаў на тэрыторыі басейна р. Шчары. Інфарматыўнасць археалагічнай карты дадзенага тыпу помнікаў з'яўляецца дастаткова высокай, таму, улічваючы іх моцную сувязь з селішчамі, разам з якімі яны складаюць асноўную крыніцу па вывучэнні сельскага насельніцтва X–XIII стст., разгляд курганных могільнікаў дапамагае вырашэнню пытанняў, звязаных з тапаграфіяй і памерамі паселішчаў, іх залежнасці ад ландшафтных умоў на тэрыторыі пэўных прыродна-геаграфічных рэгіёнаў.

У сваю чаргу храналогія і этнічная інтэрпрэтацыя пахавальных помнікаў з'яўляюцца неад'емнай часткай іх прасторавай характарыстыкі, таму існуе неабходнасць разгледзець і прааналізаваць комплекс вядомай на сённяшні дзень інфармацыі і адносна помнікаў на тэрыторыі басейна р. Шчары.

Разглядаемы рэгіён выступае як адзіны геаграфічны раён з добра азначанымі натуральнымі межамі: на поўначы – Нёман, на захадзе – р. Зальвянка з яе правым прытокам Ружанкай, на ўсходзе – р. Моўчадзь і водападзел паміж вярхоўямі Шчары, Сэрвачы ды Ушы, на поўдні – забалочаны водападзел паміж сярэднім цячэннем Шчары і Ясельдай. На азначанай тэрыторыі вядома 103 курганныя могільнікі (мал. 1), што складае прыкладна палову ад усёй колькасці выяўленых тут сярэдневяковых помнікаў. Раскопкі праводзіліся ў 10 курганных групах (9,7 % ад вядомай колькасці): Галынка (суч. Старая Галынка) Зэльвенскага раёна, Збочна, Клепачы (воз. Бяздоннае), Васілевічы, Піронім, Паўлавічы, Вішаў (суч. Вішава) і Орлавічы (суч. Новаорлавічы) Слонімскага раёна, Сенькавічы Івацэвіцкага раёна і Серабрышча Баранавіцкага раёна.

Галынкаўскі курганны могільнік знаходзіцца паміж вёскамі Старая Галынка і Клімавічы, за 1 км ад апошняй, недалёка ад берага р. Луконіцы (мал. 1, *38*) [1, с. 139, № 95]. У архіве Дзяржаўнага

© Максімовіч А. М., 2016



Мал. 1. Курганныя могільнікі на тэрыторыі басейна р. Шчары

археалагічнага музея ў Варшаве Л. Д. Побаль знайшоў паведамленне, што Я. Фітцке раскапаў тут тры курганы. У адным з іх быў выяўлены гаршчок, зроблены на ганчарным крузе, ды вугаль, у другім – фрагменты кругавога посуду з лінейным арнаментам, трэці – безынвентарны [2, с. 126].

Могільнік каля в. Збочна знаходзіцца на заходняй ускраіне вёскі, на беразе асушанага рэчышча р. Акоўкі (мал. 1, *51*). Размешчаны ён быў на гарадзішчы і з паўночна-ўсходняга боку ад яго. Напрыканцы XIX ст. насыпы захаваліся не толькі побач з гарадзішчам, але і на яго пляцоўцы. У 1892 г. помнік абследаваў святар сынкавіцкай царквы Я. М. Міхайлоўскі. Ён адзначыў, што мясцовыя жыхары, якія захоўвалі тут у ямах бульбу, рэгулярна знаходзілі чарапы, касцякі, спарахнелае дубовае дрэва, цэлы і пабіты гліняны посуд, часам арнаментаваны [3, с. 173]. Аналагічныя знаходкі выявіў і сам Я. М. Міхайлоўскі падчас больш блізкага азнаямлення з мясцовымі курганамі. Ён зрабіў спробу раскапаць два насыпы – на пляцоўцы гарадзішча і ў полі побач з ім.

У кургане, які знаходзіўся на пляцоўцы, святар знайшоў пад слоем камянёў раструшчаныя чарапы, косткі, біты посуд і дрэва, што знаходзіліся не глыбей за 0,4 м ад глебавай паверхні насыпу. На паўночным усходзе, адразу за рвамі і валамі, даследчык раскапаў яшчэ адно пахаванне. У адрозненне ад папярэдняга кургана, тут Я. М. Міхайлоўскі заглыбіўся на 1 м ад вяршыні насыпу, дзе выявіў два шкілеты, арыентаваныя галавой на ўсход. На пальцы аднаго з іх быў пярсцёнак са свінца ці срэбра ў выглядзе змейкі, а на ўзроўні тазавых касцей – два тачыльныя камяні. Акрамя таго, у пахаванні была прасочана драўляная парахня. Патрэбна адзначыць, што з прычыны забабонаў мясцовага насельніцтва ні адзін з курганоў Я. М. Міхайлоўскі не здолеў раскапаць да канца [3, с. 173].

У 1995 і 1997 гг. падчас вывучэння абарончых канструкцый гарадзішча А. А. Дабрыян і С. А. Піваварчык выявілі і даследавалі яшчэ два пахаванні. Адно з іх знаходзілася ў насыпе знешняга вала на глыбіні 1 м, другое – каля падэшвы ўнутранага вала на глыбіні 0,4–0,5 м. Пахаванні жаночыя, захаванасць касцякоў даволі дрэнная. Рэшткі першага былі арыентаваны на паўднёвы захад, другога – на захад [4, с. 68–70]. У першым выпадку нябожчыца была абстаўлена камянямі і знаходзілася на падсыпцы з шэрага пяску. У нагах памерлай сярод камянёў былі знойдзены гаршчок з лінейным арнаментам і кубак, напалову пакрыты паліваю,

сустракаліся сярод камянёў і дробныя кавалкі касцей. Рэчавы інвентар складаўся з трапецападобнай падвескі з прымацаванымі да яе трохкутнымі пласцінкамі, адной завушніцы і трох залаташкляных пацерак [4, с. 69]. У другім пахаванні каменная канструкцыя адсутнічала, каля галавы знаходзіліся раструшчаны гаршчок і глінянае біканічнае праселка. Астатні рэчавы інвентар складаўся з размешчаных у раёне рэбраў 14 шкляных і каменных пацерак, разам з 11 бронзавымі палутараабаротнымі кольцамі. На касцях правай рукі быў бронзавы віты бранзалет і выкананы ў аналагічным стылі бронзавы пярсцёнак [4, с. 69–70]. Зыходзячы з асаблівасцей пахавальнага інвентару, даследчыкі датавалі могільнік XI–XII стст. [4, с. 70].

У 1982 г. А. В. Квяткоўская даследавала адзін курган каля в. Клепачы (воз. Бяздоннае) (мал. 1, *52*). Размяшчаўся насып за 2,5 км ад вёскі на беразе возера на адлегласці прыкладна 12 м на паўднёвы захад ад каменных магіл, якіх тут вядома больш за сто. Вышыня кургана на момант раскопак складала крыху болей за 1 м. Па словах мясцовых жыхароў, у 1930-я гады насып спрабавалі расковаць, але акрамя невялікага вогнішча нічога не знайшлі. Падчас раскопак А. В. Квяткоўскай, у цэнтральнай частцы кургана, адразу пад дзірваном, на глыбіні да 0,1 м былі выяўлены сценкі ляпной пасудзіны. На ўзроўні старажытнага гарызонту ў паўднёва-заходняй і паўднёва-ўсходняй частках па перыметры насыпу ляжалі камяні. У цэнтры знаходзіліся 6 шкілетаў, арыентаваных галовамі на захад. Рэчаў пры касцяках не было [5, с. 52; 6, с. 16]. Засноўваючыся на асаблівасцях пахавальнага абраду і фрагментах посуду, даследчыца датавала курган XII–XIII стст. [5, с. 53].

У цэнтральнай частцы в. Васілевічы размяшчаўся курганны могільнік (мал. 1, *53*), які на сённяшні дзень не існуе. У ім налічваўся 31 насып. Адзін з іх у 1955 г. быў даследаваны Ф. Д. Гурэвіч. У розных частках і на рознай глыбіні кургана былі выяўлены 11 шкілетаў з рознай ступенню захаванасці, арыентаваных галовамі на захад [7, с. 13–15]. Рэчаў пры нябожчыках не было, але ў адной з дзвюх каменных кладак ва ўсходняй частцы насыпу была знойдзена срэбная манета Жыгімонта I (1506–1544 гг.) [7, с. 14, мал. 17: 4–5]. Адказаць, ці былі гэтыя пахаванні адначасовымі, не ўяўляецца магчымым. Як паведамляе Ф. В. Пакроўскі, ва ўр. Ляшчына, што каля вёскі Піронім (мал. 1, *61*), адзін курган раскапаў памешчык Бронскі, на зямлі якога і размяшчаўся могільнік [8, с. 22]. Адпаведнай дакументацыі, калі такая мелася, не захавалася. Можна меркаваць толькі аб магчымым пахаванні, здейсненым па абрадзе трупапалажэння, бо вядома, што падчас раскопак былі выяўлены чалавечыя косці.

Праводзілася даследаванне і на могільніку каля в. Паўлавічы (мал. 1, *69*). Помнік вядомы яшчэ з XIX ст. У 1892 г. падчас абследавання мясцовасці адзін з кurганоў, які з'яўляўся самым вялікім, вывучыў Я. М. Міхайлоўскі. Ён заклаў невялікі шурф на схіле насыпу за 1,5 м ад яго цэнтра. На глыбіні прыкладна ў 1 м быў выяўлены прапластак зямлі, падобнай «да пораху», магутнасцю 0,15 м, у якім знаходзіліся рэшткі спарахнелага дрэва [3, с. 166–167]. Акрамя таго, Я. М. Міхайлоўскі паведамляе, што побач з курганамі трапляюцца косткі і старажытная зброя. Мясцовымі жыхарамі былі знойдзены доўгі нож, накшталт мяча, і «кашуля» з меднага дроту [3, с. 167].

У 1962 г. яшчэ адзін курган пад Паўлавічамі вывучыў В. В. Сядоў. У насыпе сустракаліся вугальныя праслойкі. У падножжы кургана пад попельнай праслойкай таўшчынёй да 0,18 м, у мацерыку, выяўлена канаўка шырынёй да 0,3 м, глыбынёй да 0,15 м, якая апярэзвала курган і была запоўнена чорным вугальным рэчывам, месцамі прасочваліся рэшткі гарэлых стаякоў. У паўднёва-ўсходняй частцы канаўка мела дзве перамычкі [9, с. 5–6]. У насыпе выяўлены два пахаванні – мужчыны і падлетка – на спіне, у выпрастаным стане, са скрыжаванымі на жываце рукамі, арыентаваныя галовамі на захад. Рэчаў пры нябожчыках не знойдзена, але каля чэрапа падлетка ляжалі два камяні. У абодвух выпадках выяўлены рэшткі спарахнелых дошак [9, с. 5–6].

Два курганы даследаваны пад Вішавам (мал. 1, *72*). У сярэдзіне XIX ст. адзін з іх раскапаны гаспадаром зямлі К. Гнаінскім. Вядома, што сярод знаходак былі некалькі бронзавых кольцаў і бляшак [10, s. 492; 11, s. 147; 8, с. 21]. Больш вядома пра даследаванне другога кургана, праведзенае ў 1881 г. М. Федароўскім. У верхніх слаях ім знойдзены фрагменты керамічнага посуду, дробнае вуголле ды косткі дробнай жывёлы. На ўзроўні старажытнай паверхні знаходзіўся мужчынскі шкілет, арыентаваны галавой на захад. Рэчавы інвентар складаўся з аскепка крэменю каля правай рукі і глінянага гаршка – каля левай [10, s. 492; 11, s. 147–148; 8, с. 21]. У археалагічнай карце Г. В. Штыхаў адзначае помнік як могільнік XI–XII стст. [1, с. 150, № 232].

Адным з найцікавейшых помнікаў у рэгіёне зяўляецца курганны могільнік пад Орлавічамі (суч. в. Новаорлавічы) (мал. 1, *73*). Па-першае, захавалася вычарпальная дакументацыя яго даследаванняў, па-другое, ён з'яўляецца самым вывучаным на сённяшні дзень на тэрыторыі басейна ракі Шчары. Тэрыторыя могільніка выкарыстоўвалася пад вясковыя могілкі, таму ўжо напачатку XX ст. частка насыпаў была моцна пашкоджана.

У 1930-я гг. пяць курганоў на паўднёвы ўсход ад могілак даследаваў Р. Якімовіч пры ўдзеле заснавальніка Слонімскага музея І.І. Стаброўскага [12; 13], па ініцыятыве якога праводзіліся раскопкі. У кургане № I (нумерацыя І.І. Стаброўскага) знаходкі адсутнічалі [2, с. 136, мал. 86, *2*]. Курган № II быў моцна пашкоджаны. На ўзроўні старажытнай паверхні быў выяўлены шкілет, арыентаваны галавой у паўднёва-заходнім кірунку [14, s. 223; 2, с. 136, мал. 87, *1–2*]. Рэчавы інвентар складаўся са шкляных пацерак [2, с. 136], пацерак дрыгавіцкага тыпу (бронзавай ажурнай пацеркі акруглай формы, зробленай са спаяных паміж сабой выгнутых дроцікаў, у месцах пайкі ёсць гранулкі, апраўленыя ў маленькія колцы [15, s. 154, tabl. 20f], пацеркі з бронзы і срэбра авальнай формы, зробленай з бронзавай бляшкі з напаянымі на яе гранулкамі, апраўленымі ў срэбныя колцы [15, s. 154, tabl. 20h]), бронзавых шчыпчыкаў [14, s. 214; 2, с. 136, мал. 87, *7*; 15, s. 154] і падпраўленай на ганчарным крузе глінянай ляпной пасудзіны, якая размяшчалася ў нагах нябожчыка [2, с. 136; 15, s. 154, tabl. 21g]. Курган № III быў практычна зруйнаваны. У падкурганнай яме былі выяўлены рэшткі пашкоджанага трупапалажэння [2, с. 136]. У кургане № IV на гарызонце ляжаў шкілет дзіцяці, арыентаваны галавой на захад [14, s. 223; 2, с. 136, мал. 87, *5*], рэчы прадстаўлены фрагментамі ляпной керамікі, падпраўленай на ганчарным крузе [15, s. 154–155]. У насыпе кургана № V, а таксама на яго паверхні знаходзіліся камяні розных памераў. Касцяк ляжаў на ўзроўні старажытнай паверхні, арыентаваны галавой на захад, з паднятай уверх правай рукой [14, s. 223; 2, с. 136, мал. 87, *4*]. Каля галавы знаходзіўся гліняны ляпны гаршчок, падпраўлены на ганчарным крузе [2, с. 136; 15, s. 155, tabl. 21a]. Засноўваючыся на атрыманых Р. Якімовічам матэрыялах, помнік датуецца XI ст. [15, s. 152].

У 1965 г. П. Ф. Лысенка і В. Р. Супрун працягнулі даследаванне курганнага могільніка пад Орлавічамі. Імі раскапаны тры курганы ва ўсходняй частцы могільніка. Пахаванні ва ўсіх насыпах былі здзейснены па абраду інгумацыі з арыенціроўкай касцякоў галавамі на захад. Трупапалажэнні размяшчаліся ў падкурганных ямах глыбінёй 0,3 м або ў насыпах на вышыні 0,2–0,4 м. Адзін курган спалучаў у сабе чатыры розначасовыя пахаванні – два мужчынскія, жаночае і дзіцячае. У самым раннім мужчынскім пахаванні былі выяўлены рэшткі драўлянай труны. Рэчавы інвентар практычна не адрозніваецца ад матэрыялаў, атрыманых раней Р. Якімовічам: невялікія ганчарныя гаршкі з лінейным арнаментам, бронзавыя шчыпчыкі, пацеркі дрыгавіцкага тыпу і шкляныя бочкападобныя пазалочаныя знутры пацеркі. У кургане з камянямі наверсе былі выяўлены рэшткі жалезнага абруча з драўлянага вядра і фрагменты керамічнага посуду. З агульнага шэрага выбіваецца пахаванне жанчыны, у якім была знойдзена лівонская манета XVI ст., што ўказвае на магчымасць і больш позняга выкарыстання помніка ў яго першапачатковай якасці [16, с. 147–148].

Акрамя орлавіцкіх курганоў, у 1965 г. П. Ф. Лысенка даследаваў яшчэ 4 насыпы каля в. Сенькавічы (мал. 1, *94*), якія размяшчаліся на мясцовых могілках на беразе р. Грыўды. Нябожчыкі ў іх былі пахаваны ў падкурганных ямах глыбінёй 0,4–0,8 м па абраду трупапалажэння, арыентаваныя галавой на захад. У насыпах былі выяўлены плямы, насычаныя попелам і дробным вуголлем. Рэчавы інвентар нешматлікі. Грунтуючыся на пахавальных абрадах і інвентары, даследчык датаваў могільнік XI–XIII стст. [17, с.192, №758].

Пра раскопкі аднаго кургана аматарам старажытнасцей з Вільні панам Мараўскім пад в. Серабрышча (мал. 1, *78*) робіць невялікае паведамленне З. Глогер. На жаль, акрамя інфармацыі пра выяўленыя ў пахаванні бронзавыя ўпрыгажэнні ніякіх даных болей не прыводзіцца, не даецца і апісанне саміх упрыгажэнняў [10, s. 491].

Такім чынам, на тэрыторыі басейна ракі Шчары вядомы толькі адзін могільнік з пахаваннямі па абраду, які можна разглядаць як крэмацыю. Астатнія ўключаюць у сябе курганы з інгумацыямі. Акрамя гэтага, ёсць шэраг паведамленняў, якія ў якасці ўскосных даных дазваляюць меркаваць пра наяўнасць насыпаў не толькі з трупапалажэннямі, але і трупаспаленнямі ў іншых месцах.

Інфармацыя, якая датычыцца курганоў з крэмацыямі, даволі няпэўная, але, улічваючы нешматлікія палявыя даследаванні ў рэгіёне, для больш дакладнай рэканструкцыі мінулага

ўзгадаць яе патрэбна. Да яе ліку адносіцца паведамленне З. Глогера аб працах па вырубцы лясных масіваў у некаторых мясцовасцях Слонімскага павета. Падчас падобных мерапрыемстваў ў паростых дрэвамі насыпах працаўнікі нярэдка натыкаліся на гліняныя гаршкі, якія, на думку даследчыка, з'яўляюцца пахавальнымі ўрнамі.

Больш дакладнымі і падрабязнымі з'яўляюцца ўскосныя даныя па могільніках з пахаваннямі па абраду трупапалажэння. Ва ўр. Лазейкаўшчына, каля вёскі Пруд (Дзятлаўскі р-н) (мал. 1, *16*) напрыканцы XIX ст. існавала каля 40 курганоў, частка якіх разворвалася. Пры аранні трапляліся чалавечыя косткі, аднойчы быў знойдзены вялікі меч [8, с. 21–22]. Падобная сітуацыя назіралася і каля в. Сынкавічы (Зэльвенскі р-н) (мал. 1, *46*), дзе была зруйнавана частка каменных курганоў. На полі, дзе яны размяшчаліся, выворвалі чалавечыя косткі, аднойчы разам са скураным ботам, у якім быў схаваны складны жалезны нож [8, с. 26]. Аб інгумацыях можна меркаваць і па характэрных западзінах у цэнтральнай частцы некранутых тут насыпаў. Падобныя паглыбленні не сустракаюцца ў каменных курганах з крэмацыямі [8, с. 26; 18, с. 42]. Чалавечыя косткі трапляліся пры аранні на тэрыторыі могільнікаў каля в. Старадзевяткавічы (Слонімскі р-н) (мал. 1, *65*) [8, с. 19], в. Гошчава (мал. 1, *95*), в. Юкевічы (мал. 1, *87*) і в. Руда (мал. 1, *92*) (Івацэвіцкі р-н). На двух апошніх трапляліся таксама страмёны, скураныя боты, срэбныя пярсцёнкі і інш. [8, с. 19–20]. У кургане каля в. Хадзявічы (мал. 1, *55*) (Слонімскі р-н) быў знойдзены чалавечы чэрап і гаршчок [8, с. 27]. Па словах мясцовых жыхароў, чалавечыя рэшткі (косці і валасы) трапляліся і падчас правядзення газавай лініі праз былы могільнік ў Васілевічах [19, с. 14].

Вызначэнне этнічнай прыналежнасці курганных могільнікаў басейна р. Шчары не з'яўляецца мэтай артыкула. На сённяшні дзень, з прычыны недастатковасці даных, зрабіць гэта канчаткова немагчыма, але для больш дакладнага апісання пахавальных помнікаў рэгіёна і ўдакладнення іх храналогіі патрэбна разгледзець асноўныя падыходы да вырашэння азначанага пытання.

На тэрыторыі басейна р. Шчары сустракаюцца курганныя старажытнасці трох тыпаў: паўсферычныя земляныя, доўгія (падоўжаныя) і каменныя курганы.

Паўсферычныя земляныя курганы складаюць большую частку курганных могільнікаў разглядаемага рэгіёна. Іх дыяметр звычайна вагаецца ў межах ад 5 да 12 м, вышыня – ад 0,5 да 1,5 м. Каля падэшвы насыпаў нярэдка назіраюцца неглыбокія заплыўшыя раўкі, часам раздзеленыя перамычкамі. Для помнікаў гэтага тыпу на тэрыторыі Верхняга Панямоння характэрны як пахаванні з крэмацыямі, так і з інгумацыямі, са значнай перавагай апошніх. Тэрыторыя басейна р. Шчары не з'яўляецца выключэннем.

Да здзейсненых па абраду крэмацыі В. В. Сядоў адносіць курганы, раскапаныя Я. Фітцке недалёка ад в. Галынка (суч. Старая Галынка), але памылкова лакалізуе іх на р. Бусяж (прыток р. Грыўда), дзе ёсць вёска з адпаведнай назвай [20, с. 121, карта 16: 44 ]. У архіве археалагічнага музея Варшавы паведамляецца пра раскопкі пад Галынкай Слонімскага павета [2, с.126]. Згодна з адміністрацыйным падзелам Польскай рэспублікі ў 1918–1939 гг. – час навуковых даследаванняў Я. Фітцке – у склад Слонімскага павета ўваходзіла толькі в. Галынка на р. Луконіцы (суч. Старая Галынка, Зэльвенскі р-н). Падобнай лакалізацыі помніка адпавядае і наяўнасць тут некалькіх курганных груп, вядомых яшчэ з XIX ст. [8, с. 28–29; 1, с. 139–140, № 95, 106], у той час, калі ў наваколлях аднайменнай вёскі на р. Бусяж могільнікі невядомы.

Інфармацыі аб раскопках галынкаўскіх курганоў няшмат. Вядома, што ў іх выяўлена кераміка, зробленая з дапамогай ганчарнага круга, і попел [2, с.126]. Тут нельга не ўзгадаць раскапаны ў 1973 г. Я. Г. Звяругам курган з крэмацыяй ва ўр. Гарадзішча (зараз паўднёвы захад г.п. Зэльва). У ім на ўзроўні старажытнай паверхні была выяўлена вугальна-попельная пляма з дробнымі перапаленымі косткамі, у верхняй частцы насыпу – рэшткі таўстасценнай глінянай пасудзіны вялікіх памераў тыпу жароўні для падсушвання зерня. Аналагічная кераміка знойдзена толькі ў ніжніх культурных слаях Навагрудка X–XI стст. [21, с. 53]. Адпаведна гэтаму прадатаваны і курган [22, с. 215–216]. Грунтуючыся на нешматлікіх даных раскопак узгаданых помнікаў, можна меркаваць, што спаленне памерлага адбывалася на месцы пахавання. Пахавальны інвентар вельмі бедны, прадстаўлены толькі рэшткамі керамічнага посуду, вырабленага на ганчарным крузе. Па знешнім выглядзе курганы з трупаспаленнямі не адрозніваюцца ад курганоў з трупапалажэннямі. Апошнія складаюць асноўную частку курганных могільнікаў у рэгіёне. На ўзроўні

старажытнай паверхні ці ў самім насыпе з трупапалажэннем часам прасочваюцца вугальна-попельныя праслойкі ці рэшткі вогнішчаў (Паўлавічы, Сенькавічы). Зрэдку на гарызонце пад пахаваннямі сустракаюцца падсыпкі з пяску (Збочна). Неаднойчы былі выяўлены рэшткі дамавін (Збочна, Паўлавічы, Орлавічы).

Сустракаюцца, у тым ліку і ў складзе аднаго могільніка, тры варыянты знаходжання нябожчыка ў кургане: у насыпе (Паўлавічы), на гарызонце (Збочна, Клепачы, Вішаў, Орлавічы) і ў падкурганнай яме (Орлавічы, Сенькавічы). Большасць складаюць пахаванні на ўзроўні старажытнай паверхні, пра што ўскосна сведчаць і знаходкі чалавечых костак на месцах разараных курганоў. Арыентацыя памерлага звычайна заходняя, з магчымымі адхіленнямі на поўнач ці поўдзень. Выключэннем з'яўляецца парнае пахаванне ў могільніку каля в. Збочна, дзе касцякі ляжалі галовамі на ўсход.

Пахавальны інвентар адсутнічае ці прадстаўлены рэштkамі керамічнага посуду, выраблленага цалкам ці часткова на ганчарным крузе. Посуд размяшчаецца ў галовах ці каля ног нябожчыка. Зрэдку сустракаюцца і больш багатыя пахаванні, дзе акрамя керамікі выяўлены пацеркі, скроневыя кольцы, пярсценкі, шчыпчыкі і інш. На тэрыторыі басейна р. Шчары найбольш прадстаўнічы матэрыял знойдзены ў курганах пад Збочнам і Орлавічамі.

Паводле сваіх характарыстык паўсферычныя земляныя курганы на тэрыторыі басейна р. Шчары не адрозніваюцца ад падобных ім помнікаў Верхняга Панямоння ўвогуле [23, с. 86–93]. У навуковай літаратуры яны аднадушна разглядаюцца ў кантэксце славянскіх старажытнасцей, але пытанне іх племяннай прыналежнасці вырашаецца па-рознаму. Складанасць этнічнай інтэрпрэтацыі тлумачыцца дастаткова бедным пахавальным інвентаром, які часта не мае этнавызначальных прыкмет. Адносна тэрыторыі басейна р. Шчары сітуацыя да таго ж ускладняецца слабай вывучанасцю пахавальных помнікаў. Не да канца высветлены асноўныя і другасныя прыкметы для вызначэння этнічнай прыналежнасці могільнікаў, што таксама абумоўлівае стракатасць навуковых поглядаў на гэты конт. З аднаго боку, галоўнай этнавызначальнай прыкметай лічаць пахавальны абрад (размяшчэнне пахавання ў насыпе, наяўнасць падсыпак, вогнішчаў, попельных праслоек і г.д.) [24, с. 225–226; 25, с. 67–68 і інш.], з другога – склад пахавальнага інвентару (наяўнасць пэўных рэчавых катэгорый) [26, с. 114; 27, с. 136 і інш.]. Зрэшты разыходжанні ў поглядах даследчыкаў датычыліся ў першую чаргу канкрэтных могільнікаў, а то і асобных пахаванняў і іх тыпаў. Вызначаючы этнічную прыналежнасць таго ці іншага помніка, навукоўцы намагаліся ўдакладніць межы рассялення пэўных славянскіх плямёнаў, у той час калі пытанне іх прыблізнага арэала, азначанага яшчэ ў летапісах, практычна не аспрэчвалася. Адпаведна гэтаму, тэрыторыя басейна р. Шчары ў час існавання тут курганнай пахавальнай традыцыі ўваходзіла ў зону рассялення дрыгавічоў. Пацвярджаюць гэта знаходкі пацерак дрыгавіцкага тыпу (Орлавічы, Сенькавічы), якія амаль не сустракаюцца на тэрыторыі іншых плямёнаў і разглядаюцца як этнічны індыкатар дрыгавічоў [28, с. 45]. Але, як адзначаюць некаторыя даследчыкі, этнічная сітуацыя на Верхнім Панямонні, напэўна, была больш складанай – значную частку мясцовага насельніцтва тут прадстаўлялі іншыя ўсходнеславянскія (драўляне, валыняне) і балцкія (яцвягі) плямёны, ці іх славянізаваныя нашчадкі, не выключаецца і прысутнасць заходніх славян – перасяленцаў з Мазовіі [28, с. 57–58; 23, с. 94–95].

Асобную складанасць уяўляе значэнне ролі камянёў у пахаваннях. Тут патрэбна перайсці да разгляду помнікаў, вядомых пад назвай каменных курганоў.

Каменныя курганы Верхняга Панямоння ў навуковай літаратуры разглядаліся не аднойчы. Але жорсткіх крытэрыяў таго, якія курганы патрэбна лічыць каменнымі, выпрацавана так і не было. Цалкам складзеных з камянёў курганоў на тэрыторыі басейна р. Шчары не вядома. Да іх ліку адносілі насыпы з уключэннямі камянёў, якія ўяўлялі сабою абкладкі, вянцы, былі пастаўлены ў нагах ці галаве нябожчыка, размяшчаліся ў вялікай колькасці ў канструкцыі кургана бессістэмна.

На тэрыторыі басейна р. Шчары зафіксавана 20 могільнікаў (19,4 % ад агульнай колькасці), у складзе якіх ёсць насыпы з уключэннем камянёў (усяго каля 130 курганоў, што складае 15 % ад агульнай колькасці насыпаў) (мал. 2, *а*). Часцей за ўсё курганы гэтых помнікаў уяўляюць сабой аднародныя групы, у якіх не сустракаюцца іншыя вядомыя ў рэгіёне старажытныя магілы, але ёсць і рэдкія выключэнні (Валоўнікі, Нагуевічы, Паўлавічы), калі побач з імі размяшчаюцца




Мал. 2. Курганныя могільнікі з каменнымі і доўгімі (падоўжанымі) курганамі:
*а* – каменныя курганы, *б* – доўгія (падоўжаныя) курганы

звычайныя земляныя курганы. Гэты факт у сваю чаргу не выключае наяўнасці камянёў унутры гэтых насыпаў ці таго, што з цягам часу камяні маглі «ўрасці» ў зямлю і стаць незаўважнымі для візуальнага абследавання.

Улічваючы адзначаную аднароднасць могільнікаў з каменнымі курганамі, цалкам лагічнай выглядае думка пра існаванне на разглядаемай тэрыторыі пэўнага насельніцтва, у пахавальнай традыцыі якога меліся свае асаблівасці – выкарыстанне камення ў пахаваннях. На карысць гэтай гіпотэзы сведчыць і дастаткова шчыльнае размяшчэнне каменных могільнікаў на тэрыторыі рэгіёна – на водападзеле Зальвянкі і Шчары, у вярхоўях левых прытокаў апошняй (р. Сіпа, р. Луконіца, р. Бяроза, р. Грыўда). Вядомы толькі тры помнікі, адарваныя ад арэала іх распаўсюджання: Нагуевічы (на беразе р. Іса), Валоўнікі і Гнаінскія (паміж вярхоўямі р. Пад'яварка і р. Дзятлаўка (левы прыток Моўчадзі)). Як было адзначана вышэй, менавіта ў Нагуевічах і Валоўніках насыпы з камянямі складаюць толькі частку могільнікаў (пры гэтым меншую), а ў Гнаінскіх помнік складаецца толькі з двух курганоў.

Адносна этнічнай прыналежнасці каменных курганоў існуюць розныя меркаванні. В. В Сядоў разглядаў іх у якасці помнікаў яцвягаў ці іх славянізаваных нашчадкаў [18, с. 50–51; 20, с. 120]. Польскія даследчыкі лічаць падобныя курганы характэрнымі для змешанага мазавецка-дрыгавіцкага насельніцтва [29, s. 361]. Вывучаючы аналагічныя пахаванні ў Пабужжы, Т. М. Каробушкіна выказвала думку аб іх прыналежнасці дрыгавічам [30, с. 34]. Таго ж пункта гледжання для Верхняга Панямоння прытрымліваецца і П. Ф. Лысенка [28, с. 54–55]. А. В. Квяткоўская наяўнасць камянёў у насыпах разглядае як рысу, характэрную для помнікаў пруса-яцвяжскага насельніцтва і менавіта ў гэтым кантэксце разглядае шэраг курганных могільнікаў азначанага рэгіёна [31, с. 26–28, 37–38, мал. 1, *5*]. У сваю чаргу Я. Г. Звяруга, апісваючы каменныя курганы, змяшчаў іх сярод балцкіх старажытнасцей, але пазней адзначыў хаатычнасць размяшчэння камянёў

у насыпах большасці даследаваных у Верхнім Панямонні курганоў і звязаў гэта з прыроднымі асаблівасцямі рэгіёна, для якога характэрна вялікая колькасць камянёў у глебе [22, с. 216]. Наяўнасць некаторай сістэмнасці ў іх размяшчэнні на ўзроўні дзённай паверхні (групаванне вакол пахавання, камяні каля ног ці галавы памерлага) адпавядае, на яго думку, і славянскім старажытнасцям [23, с. 89]. Відавочна, што так званыя каменныя курганы складаюць тут асобны тып помнікаў, які знаходзіць сваё развіццё ў больш позніх каменных магілах, але правесці дакладную рысу паміж славянскай і славянізаванай балцкай прыналежнасцю сёння не ўяўляецца магчымым. Нават калі каменныя могільнікі з'яўляюцца пахаваннямі асобнай этнічнай групы, яна не была адасоблена ад астатняй часткі насельніцтва рэгіёна, пра што сведчыць суіснаванне тут побач розных тыпаў курганных могільнікаў.

Самымі нешматлікімі на тэрыторыі басейна р. Шчары з'яўляюцца падоўжаныя курганы (мал. 2, *б*). Яны звычайна знаходзяцца ў тых жа могільніках, што і паўсферычныя земляныя, але колькасць іх значна меншая. Па знешнім выглядзе гэта авальныя ці прамакутныя ў плане насыпы даўжынёй каля 20 м, шырынёй – каля 10 м, вышынёй – да 1,5 м. Амаль ва ўсіх выпадках каля падэшвы курганоў захаваліся раўкі. У межах азначанай тэрыторыі сёння можна казаць толькі пра 11 насыпаў гэтага тыпу ў складзе 4 могільнікаў (Абелькавічы, Дзямянаўцы-1, Дзямянаўцы-2, Пустаборы-1). Ні адзін з іх не даследаваўся. Амаль не праводзіліся раскопкі падоўжаных курганоў і на тэрыторыі Верхняга Панямоння ўвогуле.

Ф. Д. Гурэвіч лічыла доўгія і падоўжаныя курганы тыповымі славянскімі пахавальнымі збудаваннямі, якія ў міжрэччы Нёмана і Заходняга Буга былі пакінуты дрыгавічамі, хоць звычайна іх разглядаюць як крывіцкія старажытнасці [32, с. 65]. Так, напрыклад, вызначаў іх прыналежнасць В. В. Сядоў, але не выключаў і магчымасць іх усходнебалцкага паходжання [23, с. 95–96]. Зразумела, што без правядзення адпаведных раскопак дакладна вырашыць гэта пытанне сёння немагчыма. Застаецца прыблізным і датаванне гэтых помнікаў, верхняя дата існавання якіх на тэрыторыі Заходняй Беларусі вызначаецца XI ст. [32, с. 65].

У дачыненні датавання паўсферычных земляных і каменных курганоў на тэрыторыі Верхняга Панямоння, аналіз дэталяў пахавальнага абраду і рэчавых комплексаў дазваляе з большай ці меншай верагоднасцю датаваць пахаванні з трупаспаленнямі X–XI стст., а з трупапалажэннямі – XI–XII стст. У XIII ст. курганная пахавальная традыцыя пачынае згасаць, саступаючы месца грунтовым магілам [23, с. 93]. Адпавядаюць гэтаму і матэрыялы раскапаных насыпаў на тэрыторыі басейна р. Шчары. Сярод знаходак, якія выступаюць асноўнымі пры датаванні, патрэбна ўзгадаць знаходкі з пахаванняў на могільніку ў Збочна. Сярод іх золаташкляныя пацеркі X–XII стст. [28, с. 52; 4, с. 69], трапецападобная падвеска з трохкутнымі прывескамі, якая мае аналогіі сярод фіна-ўгорскіх старажытнасцей X–XI стст. [4, с. 69]. Да старажытнасцей XI–XII стст. адносяцца таксама вітыя бронзавыя пярсцёнак і бранзалет [28, с. 52; 4, с. 70], палутараабаротныя скроневыя кольцы [29, s. 361; 4, с. 70]. Выключэннем з'яўляюцца пахаванні ў курганах пад Орлавічамі і Васілевічамі з манетамі XVI ст. [7, с. 14, мал. 17, *4–5*; 16, с. 147–148]. Гэта можа тлумачыцца выкарыстаннем тэрыторыі курганных могільнікаў ў якасці могілак і ў больш позні час, калі нябожчыка маглі хаваць і ў магіле, выкапанай непасрэдна ў насыпе кургана. Акрамя таго, у абодвух азначаных выпадках маюць месца насыпы з розначасовымі пахаваннямі. Спробы ўдакладніць датаванне курганных могільнікаў разглядаемага рэгіёна нават у межах асобнага помніка па матэрыялах курганоў, раскапаных тут, на сённяшні дзень будуць не дастаткова абгрунтаванымі.

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. *Штыхов, Г. В.* Археологическая карта Белоруссии / Г. В. Штыхов. – Минск: Полымя, 1971. – Вып. 2.: Памятники железного века и эпохи феодализма. – 275 с.

2. *Поболь, Л. Д.* Древности Белоруссии в музеях Польши / Л. Д. Поболь; под ред. Ю. В. Кухаренко. – Минск: Наука и техника, 1979. – 208 с.

3. *Михайловский, Е.* Археологические очерки Слонимского уезда, Гродненской губернии / Е. Михайловский // Труды Виленского отд-ния Моск. предварительного ком. по устройству в Вильне IX археологического съезда. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1893. – Отдел II. – С. 165–187.

4. *Дабрыян, А. А.* Гарадзішча Збочна – унікальны археалагічны помнік / А. А. Дабрыян, С. А. Піваварчык // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў; рэдкал.: І. П. Крэнь [і інш.]. – Слонім, 2002. – С. 67–72.

5. *Кваткоўская, А. В.* Пахавальныя помнікі пруса-яцвяжскага насельніцтва на Слонімшчыне / А. В. Кваткоўская // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў; рэдкал.: І. П. Крэнь [і інш.]. – Слонім, 2002. – С. 49–61.
6. *Квятковская, А. В.* Отчет о полевых исследованиях в Гродненской области в 1982 году / А. В. Квятковская // ААНД ДНУ «Інстытутгісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 785.
7. *Гуревич, Ф. Д.* Отчет о работе Славяно-литовского отряда Прибалтийской экспедиции за 1955 г. / Ф. Д. Гуревич // ААНД ДНУ «Інстытутгісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 11.
8. *Покровский, Ф. В.* Археологическая карта Гродненской губернии / Ф. В. Покровский. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1895. – 165 с.
9. *Седов, В. В.* Отчет о полевых работах Верхнеднепровского отряда Института археологии АН СССР на территории Белоруссии в 1962 г. / В. В. Седов // ААНД ДНУ «Інстытутгісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 228.
10. *Glogier, Z.* NotatkiarcheologiczneMichała Fedorowskiego z okolic Słonima. Kurhany pod Wiszowem / Z. Glogier // Pamiętnik fizyjograficzny. – Warszawa : Druk. K. Kowalewskiego, 1882. – T. II. – S. 491–492.
11. *Gloger, Z.* Korespondencya do redakcyi Biblioteki Warszawskiej / Z. Gloger // Biblioteka Warszawska. – Warszawa : Druk. Józefa Bergera, 1882. – S. 147–148.
12. *Stabrowski, J.* Notatkiarcheologiczne z powiatu Słonimskiego / J. Stabrowski // Wiadomości Archeologiczne / Państwowe muzeum archeologiczne w Warszawie; red. R. Jakimowicz. – Warszawa, 1935. – T. XIII. – S. 175–177.
13. *Jakimowicz, R.* Sprawozdanie z działalności Państwowego Muzeum Archeologicznego za 1928 rok / R. Jakimowicz // Wiadomości Archeologiczne / Państwowe muzeum archeologiczne w Warszawie ; red. R. Jakimowicz. – Warszawa, 1935. – T. XIII. – S. 232–278.
14. *Jakimowicz, R.* Sprawozdanie z działalności Państwowego Muzeum Archeologicznego za 1927 rok / R. Jakimowicz // Wiadomości Archeologiczne / Państwowe muzeum archeologiczne w Warszawie; red. R. Jakimowicz. – Warszawa, 1935. – T. XIII. – S. 213–231.
15. Zabytki z okresu wpływow rzymskich, średniowiecza i czasów nowożytnych z Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie / pod red. A. Piotrowskiego. – W.: DEKA, 2005. – 264 s.
16. *Супрун, В. Р.* Орлавічы / В. Р. Супрун // Археалогія Беларусі: у 2 т.; рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.]. – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 147–148.
17. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1984. – 424 с.
18. *Седов, В. В.* Курганы ятвягов / В. В. Седов // Сов. археология. – 1964. – № 4. – С. 36–51.
19. *Максімовіч, А. М.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай абласцей у 2013 г. / А. М. Максімовіч // Архіў археалагічнай навуковай дакументацыі ІГ НАН Беларусі. – Спр. № 3043.
20. *Седов, В. В.* Восточные славяне в VI–XIII вв. / В. В. Седов ; под ред. Б. А. Рыбакова; Ин-т археологии АН СССР. – М.: Наука, 1982. – (Археология СССР с древнейших времен до средневековья в 20 томах).
21. *Малевская-Малевич, М. В.* Керамика западнорусских городов X–XIII вв. / М. В. Малевская-Малевич; под ред. С. В. Белецкого; ИИМК РАН. – СПб.: Нестор-История, 2005. – 160 с. – (Труды ИИМК РАН. Т. XVII).
22. *Звяруга, Я. Г.* Раскопкі курганоў у вярхоўях Росі і Зальвянкі / Я. Г. Звяруга // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А. Г. Калечыц (гал.рэд.) [і інш.]. – Мн., 2006. – Вып. 22. – С. 210–216.
23. *Звяруга, Я. Г.* Насельніцтва Панямоння / Я. Г. Звяруга // Археалогія Беларусі: у 4 т.; рэдкал.: П. Ф. Лысенка (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2000. – Т. 3: Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.). – С. 84–108.
24. *Завитневич, В. З.* Формы погребального обряда в могильных курганах Минской губернии / В. З. Завитневич // Труды девятого археологического съезда в Вильне; под ред. гр. Уваровой и С. С. Слуцкого. – М.: Тип. Э. Лиснера и Ю. Романа, 1895. – Т. 1. – С. 221–235.
25. *Русанова, И. П.* Территория древлян по археологическим данным / И. П. Русанова // Сов. археология. – 1960. – № 1. – С. 63–69.
26. *Седов, В. В.* Дреговичи / В. В. Седов // Сов. археология. – 1963. – № 3. – С. 112–125.
27. *Гуревич, Ф. Д.* Древности Белорусского Понеманья / Ф. Д. Гуревич; под ред. П. Н. Третьякова. – М.; Л.: АН СССР, 1962. – 222 с.
28. *Лысенка, П. Ф.* Дрыгавічы / П. Ф. Лысенка // Археалогія Беларусі: у 4 т. / рэдкал.: П. Ф. Лысенка (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2000. – Т. 3.: Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.). – С. 32–58.
29. *Jaskanis, D.* Materiały z badań wczesnośredniowiecznego cmentarzyska w miejscowości Podroś koło Wołkowyska w BSRR / D. Jaskanis // Rocznik Białostocki / Muzeum w Białymstoku; red. Wł. Antoniewicz. – Białystok, 1962. – T. III. – S. 337–363.
30. *Коробушкина, Т. Н.* Среднее Побужье в IX–XIII вв. / Т. Н. Коробушкина // Восточная Европа в древности и средневековье : Докл. междунар. науч. конф., посвящ. 75-летию проф. Э. М. Загорульского / науч. ред. А. А. Егорейченко. – Минск: БГУ, 2004. – С. 28–36.
31. *Квятковская, А. В.* Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI–XVII в.) / А. В. Квятковская. – Vilnius: Diemedzio, 1998. – 327 с.
32. *Гуревич, Ф. Д.* О длинных и удлиненных курганах в Западной Белоруссии / Ф. Д. Гуревич // Краткие сообщ. Ин-та истории материальной культуры / АН СССР ;редкол.: Т. С. Пассек (отв. ред.) [и др.]. – М., 1958. – Вып. 72. – С. 54–65.

*Паступіў у рэдакцыю 01.09.2015*